Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
_________________Ю. П. Бондар
«____» ________________ 2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

# БІБЛІЯГРАФАВАННЕ КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАКУМЕНТАЎ

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэказнаўства*
*і бібліяграфія (менеджмент), спецыялізацыі 1-23 01 11-01 05*
*Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнік**

*В. І. Саітава,* дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*Д. В. Скубілаў,* загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна»;

*С. В. Зыгмантовіч,* загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 20.09. 2012 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 06.02.2013 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *А. І. Гутарава*
Адказны за выпуск *В. І. Саітава*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць засваення дысцыпліны «Бібліяграфаванне краязнаўчых дакументаў» абумоўлена важнасцю авалодвання студэнтамі прафесійнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, неабходнымі для стварэння краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі.

*Мэтай* дысцыпліны з'яўляецца вывучэнне перадавой методыкі і тэхналогіі працэсу бібліяграфавання краязнаўчых дакументаў. Актуальнасць дысцыпліны абумоўлена значным узрастаннем дзейнасці бібліятэк розных відаў і тыпаў па падрыхтоўцы разнастайнай краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі з прымяненнем як традыцыйнай, так і аўтаматызаванай тэхналогіі. Падрыхтоўка краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, заснаваная на агульнай методыцы і тэхналогіі вытворчасці дакументаванай інфармацыйнай прадукцыі, характарызуецца ўласцівымі толькі гэтым рэсурсам задачамі, мэтамі, метадамі стварэння.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае вырашэнне наступнага кола *задач*:

– раскрыць значэнне падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў і электронных рэсурсаў для інфармацыйнага забеспячэння рэгіянальнага развіцця, краязнаўчага руху і папулярызацыі краязнаўчых ведаў;

– забяспечыць авалодванне традыцыйнай і аўтаматызаванай тэхналогіямі падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў, тыпаў, жанраў.

У выніку засваення дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– тэарэтыка-метадычныя асновы бібліяграфавання краязнаўчых дакументаў;

– тэхналагічныя этапы падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў;

– спецыфіку асобных тэхналагічных працэсаў;

– прызначэнне і метадычныя асаблівасці асобных відаў, тыпаў і жанраў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, электронных бібліяграфічных рэсурсаў.

Студэнт павінен *умець:*

– выяўляць, адбіраць, групаваць інфармацыйныя (дакументныя) аб'екты з улікам асаблівасцей ствараемых краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ствараць бібліяграфічныя запісы для розных відаў, тыпаў, жанраў бібліяграфічнай прадукцыі;

– рыхтаваць даведачна-метадычны апарат (прадмовы, уводныя артыкулы, дапаможныя паказальнікі, дадаткі і інш.) для канкрэтных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў;

– ствараць бібліяграфічныя дапаможнікі вызначанага віду, тыпу, жанру;

– рэдагаваць краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі;

– ацэньваць якасць падрыхтоўкі краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі.

Дысцыпліна «Бібліяграфаванне краязнаўчых дакументаў» цесна звязана з шэрагам іншых вучэбных дысцыплін. Яна паглыбляе і пашырае вучэбную дысцыпліну «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства». З раздзеламі, прысвечанымі дакументалогіі і гісторыі кнігі, дысцыпліны «Тэорыя інфармацыі і дакументалогія» яе аб’ядноўвае вывучэнне спецыфікі дакументных крыніц інфармацыі. З дысцыплінамі «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя» і «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» яна звязана праз вывучэнне працэсу бібліяграфавання, аднаго з асноўных працэсаў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Сувязь з дысцыплінай «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя» прасочваецца ў аспекце разгляду ўзнікнення і развіцця самастойнага напрамку ў сусветнай і беларускай бібліяграфічнай дзейнасці па стварэнні краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. З «Гісторыяй краязнаўства Беларусі» яе звязвае ацэнка метадычнага вопыту стварэння краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў айчыннымі бібліятэкамі і іншымі сацыяльнымі інстытутамі сістэмы дакументных камунікацый.

Сярод эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій пры вывучэнні дысцыпліны «Бібліяграфаванне краязнаўчых дакументаў», якія садзейнічаюць засваенню і фарміраванню прафесійных ведаў і ўменняў, выдзелім:

– практычныя бібліяграфічныя метады (пошуку, ідэнтыфікацыі і інш.);

– тэхналогію вучэбна-даследчай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбнай і даследчай дзей-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне.

У мэтах фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў пры правядзенні семінарскіх і практычных заняткаў выкарыстоўваюцца методыкі актыўнага навучання.

Паводле графіка выконваецца і кантралюецца самастойная работа студэнтаў. Змест самастойнай работы накіраваны на паглыбленне тэарэтыка-метадычных ведаў бібліяграфавання краязнаўчых дакументаў, засваенне тэхналагічных уменняў, выпрацоўку ацэначнага (крытычнага) прафесійнага мыслення, неабходнага для кіравання якасцю бібліяграфічнай прадукцыі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Бібліяграфаванне краязнаўчых дакументаў» адводзіцца 126 гадзін, з якіх 70 гадзін аўдыторных заняткаў: 18 – лекцыі, 8 – семінары, 44 – практычныя заняткі. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Кольскасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінары | прак. заняткі |
| **Уводзіны** | 1 | 1 | | |
| **Раздзел І. Асобныя тэхналагічныя працэсы і аперацыі падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў** | | | | |
| *Тэма 1.* Фіксаваныя краязнаўчыя веды як аб’ект бібліяграфавання | 2 | 2 | | |
| *Тэма 2.* Асаблівасці падрыхтоўчага і аналітычнага этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў | 2 | 2 | | |
| *Тэма 3.* Асаблівасці сінтэтычнага і заключнага этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў | 4 | 2 | 2 | |
| **Раздзел ІІ. Методыка падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў асобных відаў, тыпаў і жанраў** | | | | |
| *Тэма 4.* Методыка падрыхтоўкі навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў | 18 | 2 | 2 | 14 |
| *Тэма 5.* Методыка падрыхтоўкі рэкамендацыйных (папулярных) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў | 22 | 4 | 2 | 16 |
| *Тэма 6.* Методыка падрыхтоўкі дапаможнікаў мясцовых выданняў | 3 | 1 | 2 | |
| **Раздзел ІІІ. Тэхналогія падрыхтоўкі краязнаўчых баз даных** | | | | |
| *Тэма 7.* Стварэнне бібліяграфічных баз даных | 10 | 2 | | 8 |
| *Тэма 8.* Стварэнне фактаграфічных, паўнатэкставых і камбінаваных баз даных | 8 | 2 | | 6 |
| **Усяго…** | **70** | **18** | **8** | **44** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
## Завочнае навучанне

| Тэмы | Кольскасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практ. заняткі | лабарат. заняткі |
| **Уводзіны** | 1 | 1 | | |
| Фіксаваныя краязнаўчыя веды як аб'ект бібліяграфавання | 1 | 1 | | |
| Асаблівасці тэхналагічных этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў | 4 | 2 | | 2 |
| Методыка падрыхтоўкі навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў | 6 | 2 | 4 | |
| Методыка падрыхтоўкі рэкамендацыйных (папулярных) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў | 6 | 2 | 4 | |
| **Усяго…** | **18** | **8** | **8** | **2** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Мэты, задачы вучэбнай дысцыпліны «Бібліяграфаванне краязнаўчых дакументаў». Яе значэнне для падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай галіны. Сувязь з іншымі дысцыплінамі агульнанавуковага і прафесійнага цыклаў. Забеспячэнне вучэбнымі, метадычнымі, нарматыўнымі і іншымі матэрыяламі і літаратурай.

Структура вучэбнай дысцыпліны. Асноўныя формы аўдыторнай і самастойнай работы студэнтаў. Выніковыя і прамежкавыя формы кантролю.

## Раздзел I. Асобныя тэхналагічныя працэсы і аперацыі падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў

### *Тэма 1. Фіксаваныя краязнаўчыя веды як аб'ект бібліяграфавання*

Бібліяграфаванне розных носьбітаў ведаў і інфармацыі, форм памяці – характэрная асаблівасць падрыхтоўкі краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі на сучасным этапе.

Значэнне вусных матэрыялаў («мемаратаў»), фіксаванне іх у працэсе стварэння краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі.

Відавы састаў друкаваных дакументаў, якія пераважаюць у краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках на сучасным этапе. Бібліяграфаванне матэрыялаў з мясцовага перыядычнага друку. Характарыстыка газетных жанраў, ацэначны падыход да адбору асобных публікацый. Бібліяграфаванне фрагментаў (лагічна выдзеленых частак тэкстаў), прысвечаных краю (рэгіёну, населенаму пункту).

Бібліяграфаванне неапублікаваных матэрыялаў, архіўных дакументаў, аўдыявідэаматэрыялаў.

Выкарыстанне ведаў і інфармацыі, прадстаўленых на электронных носьбітах, у Інтэрнэце, у працэсе падрыхтоўкі краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі.

Пранікненне бібліяграфічнай інфармацыі ў тэкст, адлюстраванне сэнсаў, фактаграфічнасць – характэрныя рысы методыкі падрыхтоўкі краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2. Асаблівасці падрыхтоўчага і аналітычнага этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў*

Патрабаванні да выбару тэмы краязнаўчага бібліяграфічнага дапаможніка і абмежаванні тэрытарыяльных меж мясцовасці. Значэнне адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу для ўстанаўлення меж тэрыторыі; улік прымет фізіка-геаграфічнага, эканамічнага, гісторыка-культурнага і іншых прымет (прынцыпаў) структуравання тэрыторыі. Падыходы да вызначэння гістарычных меж рэгіёну з улікам змяненняў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ў розныя гістарычныя перыяды.

Асноўныя крыніцы выяўлення краязнаўчых дакументаў. Мэтавае і чытацкае прызначэнне краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў.

Асноўныя патрабаванні да бібліяграфічнага апісання краязнаўчых дакументаў; выкарыстанне дзеючых стандартаў і правіл бібліяграфічнага апісання пры стварэнні краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі. Раскрыццё краязнаўчага зместу дакументаў з прымяненнем формы бібліяграфічнага апісання «Са зместу:».

Асаблівасці бібліяграфічных апісанняў дакументаў лацінскага шрыфту ў латэнтных краязнаўчых бібліяграфічных матэрыялах XVIII ст.; улік тагачасных умоўных абазначэнняў і пунктуацыі пры пераўтварэнні структуры бібліяграфічных апісанняў у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі.

Віды анатацый па розных прыметах, якія прымяняюцца ў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках. Этапы падрыхтоўкі анатацый, структура анатацый розных відаў. Спецыфічныя элементы анатацый на краязнаўчыя дакументы. Асаблівасці анатавання літаратуры розных відаў (навуковай, даведачнай, мастацкай і інш.) пры падрыхтоўцы краязнаўчых дапаможнікаў. Асноўныя навуковыя публікацыі і метадычныя рэкамендацыі па анатаванні краязнаўчай літаратуры (М. В. Здобнава, А. В. Мамантава, РНБ, НББ і інш.). Анатаванне электронных рэсурсаў, адлюстраваных у краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3. Асаблівасці сінтэтычнага і заключнага этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў*

Характарыстыка тэхналагічных працэсаў сінтэтычнага этапу: адбору дакументаў, групоўкі бібліяграфічных запісаў, састаўлення дапаможных паказальнікаў. Патрабаванні да адбору новых публікацый з газет і рэтраспектыўнага адбору матэрыялаў з перыядычных выданняў. Характарыстыка груповак бібліяграфічных запісаў; адаптацыя структуры «Тыпавой схемы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь» у дапаможніках асобных тыпаў.

Прызначэнне дапаможных паказальнікаў для аптымізацыі пошукавых магчымасцей у сістэме краязнаўчых бібліяграфічных ведаў, адлюстраваных у бібліяграфічным дапаможніку. Склад дапаможных паказальнікаў, якія атрымалі найбольшае распаўсюджанне ў краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі. Залежнасць выбару дапаможных паказальнікаў ад відатыпалагічных і жанравых асаблівасцей бібліяграфічных дапаможнікаў.

Методыка падрыхтоўкі імянных і персанальных дапаможных паказальнікаў. Састаў імянных і персанальных рубрык. Пашырэнне іх інфарматыўнасці за лік уключэння фактаграфічных даных.

Методыка падрыхтоўкі геаграфічных дапаможных паказальнікаў. Састаў геаграфічных рубрык, уключэнне тэматычных, храналагічных і іншых падрубрык у складаныя геаграфічныя рубрыкі. Абазначэнне статусу геаграфічных аб'ектаў з дапамогай умоўных скарачэнняў.

Методыка падрыхтоўкі паказальнікаў устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый.

Значэнне і прымяненне спасылак у дапаможных паказальніках розных відаў.

Асноўныя тэхналагічныя працэсы заключнага этапу: падрыхтоўка даведачна-пошукавага апарату, рэдагаванне і падрыхтоўка дапаможніка да друку. Патрабаванні да прадмоў, уводных тэкстаў. Спісы прагледжаных крыніц. Віды рэдагавання краязнаўчых дапаможнікаў. Удзел краязнаўцаў, вучоных і спецыялістаў у навуковым рэдагаванні. Афармленне розных форм краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значэнне рэдагавання для ўдасканалення падрыхтаваных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, яго віды. Задачы навуковага рэдагавання, выкарыстанне мясцовых краязнаўцаў, даследчыкаў і спецыялістаў у якасці навуковых рэдактараў. Змест кансультацый навуковых рэдактараў на асобных тэхналагічных этапах падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

Задачы літаратурнага рэдагавання. Моўна-стылістычныя патрабаванні да краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў і жанраў.

Задачы бібліяграфічнага рэдагавання. Тыповыя памылкі, якія выпраўляюцца падчас бібліяграфічнага рэдагавання.

## Раздзел II. Методыка падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў асобных відаў, тыпаў і жанраў

### *Тэма 4. Методыка падрыхтоўкі навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў*

Мэтавае і чытацкае прызначэнне навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Тэхналогія падрыхтоўкі асобных тыпаў і жанраў краязнаўчых навукова-дапаможных паказальнікаў: універсальных бягучых і рэтраспектыўных, галіновых, тэматычных, персанальных/біябібліяграфічных, прац устаноў рэгіёну і аглядаў розных відаў, паказальнікаў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

Абгрунтаванне выбару віду, тыпу і жанру дапаможніка. Вызначэнне мэтавага і чытацкага адраса, меж тэрыторыі, структуры дапаможнікаў, кола крыніц выяўлення дакументаў, крытэрыяў адбору і спосабаў бібліяграфічнай характарыстыкі дакументаў, падбор ілюстрацыйнага матэрыялу і іншыя прыватныя метадычныя рашэнні.

Выкарыстанне праграмнага забеспячэння пры падрыхтоўцы навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў у электронным рэжыме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 5. Методыка падрыхтоўкі рэкамендацыйных (папулярных) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў*

Мэтавае і чытацкае прызначэнне рэкамендацыйных, у тым ліку папулярных, краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, іх асноўныя тыпы і жанры. Метадычная характарыстыка ўніверсальных і комплексных рэтраспектыўных дапаможнікаў тыпу «Што чытаць аб краі» («Край: мінулае і сучаснасць»), галіновых, тэматычных, персанальных (біябібліяграфічных), календароў знамянальных і памятных дат. Метадычная характарыстыка асобных тыпаў і жанраў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў: папулярнай краязнаўчай энцыклапедыі, бібліяграфічнага нарыса, даведніка, хронікі і інш. Вырашэнне пытанняў меж тэрыторыі, адбору і бібліяграфічнай характарыстыкі дакументаў (тэкстаў), сродкаў стымулявання чытання, суадносін бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, структуры дапаможнікаў, групоўкі бібліяграфічных запісаў, складу даведачна-метадычнага апарату, ілюстрацый і інш.

Выкарыстанне праграмнага забеспячэння пры падрыхтоўцы рэкамендацыйных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў у электронным рэжыме і прадстаўленне іх на сайтах бібліятэк.

## *Тэма 6. Методыка падрыхтоўкі дапаможнікаў мясцовых выданняў*

Мэтавае і чытацкае прызначэнне дапаможнікаў мясцовых выданняў, іх асноўныя тыпы. Метадычная характарыстыка паказальнікаў мясцовых кніг (асобных выданняў) і перыядычнага друку. Вызначэнне меж тэрыторыі, структуры дапаможнікаў, кола крыніц выяўлення мясцовых выданняў, крытэрыяў адбору і спосабаў бібліяграфічнай характарыстыкі дакументаў, іншых прыватных метадычных рашэнняў.

Выкарыстанне праграмнага забеспячэння пры падрыхтоўцы дапаможнікаў мясцовага друку ў электронным рэжыме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Тэхналогія падрыхтоўкі краязнаўчых баз даных

### *Тэма 7. Стварэнне бібліяграфічных баз даных*

Значэнне бібліяграфічных баз даных па краязнаўстве і баз даных (БД) мясцовага друку ў забеспячэнні патрэб у краязнаўчых ведах і інфармацыі; шырыня іх карыстальніцкага і мэтавага прызначэння. Склад найбольш распаўсюджаных бібліяграфічных БД, генерыруемых бібліятэкамі: электронны краязнаўчы каталог, універсальная БД тыпу «Краязнаўчая літаратура», БД мясцовых дакументаў і інш. Асаблівасці вядзення электронных краязнаўчых каталогаў у бібліятэках Беларусі. Выкарыстанне АБІС «ALIS WEB» НВФ «ІНЕАК». Рэалізацыя патрабаванняў да бібліяграфічных БД: паўната адлюстравання дакументаў, дакладнасць, шматаспектнае раскрыццё зместу і фармальных прымет дакументаў, структураванасць, даступнасць, пошукавыя магчымасці.

Актуальнасць генерыравання зводных краязнаўчых БД на аснове тэхналогій карпаратыўнай каталагізацыі ў межах рэгіёну; прадстаўленне бібліяграфічных запісаў у бібліяграфічныя БД, ствараемыя на аснове карпаратыўных тэхналогій у межах краіны.

### *Тэма 8. Стварэнне фактаграфічных, паўнатэкставых і камбінаваных баз даных*

Значэнне фактаграфічных, паўнатэкставых і камбінаваных БД для адлюстравання культурна-гістарычнай спадчыны і адметнасці рэгіёнаў (населеных пунктаў). Разнастайнасць фактаграфічных БД, прадстаўленне ў іх фактаграфічных, графічных і бібліяграфічных матэрыялаў аб падзеях, персонах і фактах культурна-гістарычнай спадчыны. Праграмны прадукт «Памяць рэгіёна» НВФ «ІНЕАК». Краязнаўчыя фактаграфічныя БД у бібліятэках Беларусі.

Адлюстраванне каштоўных і рэдкіх дакументаў (калекцый) у паўнатэкставых БД, іх бібліяграфічнае аснашчэнне. Краязнаўчыя паўнатэкставыя БД у бібліятэках Беларусі.

Характарыстыка краязнаўчых камбінаваных БД, у тым ліку генерыруемых бібліятэкамі Беларусі. Іх бібліяграфічнае аснашчэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *ГОСТ 7.9-95* (ИСО 214-76) Реферат и аннотация. Общие требования – Взамен ГОСТ 7.9-77 ; введ. 01.07.1997.

2. *СТБ ГОСТ 7.0-2004.* Інфармацыйнайна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія. Тэрміны і азначэнні = Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения. – Узамен ГОСТ 7.0-84, ГОСТ 7. 26-80 ; уведз. 03.01.2005.

3. *Ажеева, Р. Б.* Историко-краеведческая деятельность публичных библиотек : учеб. пособие / Р. Б. Ажеева. – М. : Литера, 2011. — 105 с. – (Серия «Современная библиотека» ; вып. 88).

4. *Библиотечное* краеведение : терминол. словарь / сост. В. С. Крейденко, А. В. Мамонтов. – СПб., 1998. – 85 с.

5. *Головко, С. И.* Проектная модель путеводителя : рек. Пособие / С. И. Головко // Мир библиографии. – 2009. – № 4. – С. 30–35.

6. *Давыдова, М.* Краеведческая литературная библиография : направления развития, виды, методика составления библиографических пособий : лекции по курсу «Библиография художественной литературы» / М. Давыдова ; МГУКИ. – Москва : МГУКИ, 2003. – 23 с.

7. *Демидова С. Е.* Краеведческий документ: библиотечная обработка : учеб.-практ. пособие / С. Е. Демидова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 104 с.

8. *Захарова, Г. Н.* Краеведческий аспект деятельности регинальной библиотеки / Г. Н. Захарова // Научные и технические библиотеки. – 2008. – № 9 . – С. 35–44.

9. *Зыгмантович, С. В.* Подготовка библиографической продукции библиотеками : науч.-практ. пособие / С. В. Зыгмантович. – Минск : Новое знание, 2009. – 229 с.

10. *Ковенько, Т. С.* Краеведческий библиографический ресурс: проблемы формирования и использования / Т. С. Ковенько // Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага – сацыякультурны і інфармацыйны цэнтр рэгіёна. Да 70-годдзя з дня заснавання : матэрыялы навук.-практ. канф., Брэст, 7–8 крас. 2010 г. / склад. А. М. Мяснянкіна ; пад агул. рэд. Ст. Р. Рачэўскага. – Брэст, 2010. – С. 37–44.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*11. Краеведческие* указатели и БД // Справочник библиографа. – 2-е изд, перераб. и доп. – СПб., 2003. – С. 420–431.

*12. Краязнаўчая* дзейнасць бібліятэк : метад. рэкамендацыі / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Р. М. Чыгірова, М. У. Сокал. – Мінск, 1994. – 102 с.

*13. Мамонтов, А. В.* Краеведческая библиография: учебник / А. В. Мамонтов, Н. Н. Щерба. – М. : Кн. палата, 1989. – 216 с.

*14. Маслова, А. Н.* Рекомендательная краеведческая библиография: «Пациент скорее жив, чем мертв» / А. Н. Маслова // Мир библиографии. – 2003. – № 3. – С. 13–18.

*15. Михлина, И. И.* Основные понятия краеведческой библиографии: учеб.-метод. пособие / И. И. Михлина. – М. : ИПО Профиздат, 2002. – 80 с.

*16. Прадзеіна, А. В.* Актуальныя пытанні краязнаўчай дзейнасці абласных бібліятэк / А. В. Прадзеіна, В. І. Саітава // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2012. – Вып. 1. – С. 94–104.

*17. Саітава, В. І.* Персанальная краязнаўчая бібліяграфія / В. І. Саітава // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2007. – № 8. – С. 122–128.

*18. Сомова, Т.Н.* Краеведческая деятельность детской библиотеки : учеб.-практ. пособие / Т. Н. Сомова ; Орловский гос. ин-т искусств и культуры. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 88 с.

*19. Тараненко, Л. Г.* Информационное обеспечение региона: специфика краеведческой деятельности библиотек / Л. Г. Тараненко. – М. : Литера, 2009. – 160 с.

*Дадатковая*

*1. Акимбетова, А. Г.* Краеведческая библиографическая деятельность библиотек на современном этапе / А. Г. Акимбетова // Новая библиотека. – 2008. – № 6. – С. 33–36.

*2. Библиотечная* энциклопедия / РГБ. – М. : Пашков дом, 2007. – С. 198–199.

*3. Бученков, А. Н.* Советское краеведческое библиографоведение / А. Н. Бученков. – М. : Книга, 1984. – 222 с.

*4. Захарова, Г. Н.* Краеведческий аспект деятельности региональной библиотеки / Г. Н. Захарова // Научные и технические библиотеки. – 2008. – № 9. – С. 35–44.

*5. Ковенько, Т. С.* Краеведческий библиографический ресурс : проблемы формирования и использования / Т. С. Ко-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

венько // Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага – сацыякультурны і інфармацыйны цэнтр рэгіёна. Да 70-годдзя з дня заснавання : матэрыялы навук.-практ. канф., Брэст, 7–8 крас. 2010 г. / склад. А. М. Мяснянкіна ; пад агул. рэд. Ст. Р. Рачэўскага. – Брэст, 2010. – С. 37–44.

6. *Кукатова, Г. И.* Областная универсальная научная библиотека: поиск новых решений в формировании информационных ресурсов региона / Г. И. Кукатова // Научные и технические библиотеки. – 2009. – № 5. – С. 19–30.

7. *Касінская, А. І.* Краязнаўчая бібліяграфія ва ўмовах інфармацыйных тэхналогій: традыцыі і навацыі / А. І. Касінская // Абласныя бібліятэкі: актуальныя пытанні дзейнасці. – Минск, 2004. – С. 38–45.

8. *Мангутова, С. Д.* Библиографическое обеспечение Петербурговедения: опыт Российской национальной библиотеки / С. Д. Мангутова // Информационно-библиографическое обслуживание : сб. ст. / Рос. нац. б-ка ; науч. ред. Е. Д. Жабко. – СПб., 2003. – Вып.1 : История и современное состояние. – С. 140–155.

9. *Маслова, А. Н.* Календари знаменательных и памятных дат / А. Н. Маслова // Мир библиографии. – 2002. – № 4. – С. 12–16.

10. *Маслова, А. Н.* Краеведение и библиотека : избр. ст. / А. Н. Маслова. – СПб. : Профессия, 2010. – 363, [1] с. – (Библиотека).

11. *Маслова, А. Н.* Тенденции развития краеведческой библиографии в Российской Федерации / А. Н. Маслова // Вестн. БАЕ. – 2005. – №1. – С. 82–88.

12. *Мілоста, Н. Н.* Бібліятэчнае краязнаўства – дзейсны сродак дакументнага і бібліяграфічнага забеспячэння краязнаўчага руху Гродзеншчыны / Н. Н. Мілоста, Л. І. Турмасава // 60-летие образования Гродненской области : материалы Междунар. науч. конф. – Гродно, 2004. – С. 227–234.

13. *Михлина, И. И.* Отбор литературы по территориальному признаку в краеведческих пособиях / И. И. Михлина // Библиография. – 1998. – № 1. – С. 35–39.

14. *Морылева, Н. И.* Научная библиотека университета в системе создания и распространения краеведческой информации : На примере науч. б-ки Новгородского ун-та / Н. И. Морылева // Научые и технические библиотеки. – 2005. – № 4. – С. 44–50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

15. *Лабастава, Г. Б.* Краязнаўчая бібліяграфія Пухавіччыны / Г. Б. Лабастава // Бібліятэка прапануе. – 2007. – № 6. – С. 29–30.

16. *Нижанковская, Л. Г.* Проблемы создания краеведческих корпаративных баз данных / Л. Г. Нижанковская // Петерб. библ. шк. – 2002. – № 1. – С. 37–40.

17. *Пирожков, Г. П.* Краеведение в условиях информатизации общества / Г. П. Пирожков // Библиотековедение. – 2007. – № 3. – С. 42–45.

18. *Подготовка* краеведческих материалов по персоналиям: метод. рекомендации / Рос. гос. б-ка для слепых ; сост. Н. Д. Шапошникова. – М., 2001. – 14 с.

19. *Пронина, Л. А.* Электронные коллекции краеведческих информационных ресурсов: библиоэкологические аспекты / Л. А. Пронина [и др.] // Вопросы библиографоведения. Методологические и теоретические проблемы библиографии в контексте новых информационных технологий. – М. : Пашков дом, 2007. – Вып. 16. – С. 76–83.

20. *Проблемы* краеведческой деятельности библиотек : материалы Всерос. науч.-практ. семинара, Великий Новгород, сент. 2002 г. – СПб., 2003. – 258 с.

21. *Рекомендательная* библиография и библиотечная практика : сб. ст. / сост. и науч. ред. С. П. Бавин. – М. : Пашков дом, 2007. – 168 с.

22. *Солодовникова, Е. П.* Территориальный аспект информации и принципы библиографирования краеведческой литературы: теоретико-методическое исследование : автореф. дис. ... канд. пед. наук : 05.25.03 / Е. П. Солодовникова ; Краснодар. гос. ун-т культуры и искусств. – Краснодар, 2001. – 16 с.

23. *Саітава, В. І.* Фотадакументы як аб'ект краязнаўчай дзейнасці бібліятэк / В. І. Саітава // XI Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск. 24–26 мая 2005 г. : матэрыялы чытанняў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – С. 121–127.

24. *Составление* краеведческих рекомендательных библиографических пособий типа «Календарь знаменательных и памятных дат» : метод. рекомендации / ГПБ ; сост. Г. М. Вольберг. – Л., 1989. – 29 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

25. *Составление* универсальных рекомендательных пособий о крае : метод. рекомендации / ГПБ ; сост. Г. М. Вольберг. – Л., 1988. – 46 с.

26. *Составление* универсальных текущих указателей краеведческой литературы : метод. рекомендации / ГПБ ; сост. Г. М. Вольберг. – Л., 1982. – 29 с.

27. *Толкунова, В.* Современные библиографические краеведческие издания как средство обеспечения доступа к краеведческой информации / В. Толкунова // Информационный бюллетень РБА. – 2003. – № 24. – С. 176–178.

28. *Шатохина, Н. З.* Краеведческие библиографические ресурсы : влияние электронных технологий / Н. З. Шатохина // Библиотековедение.– 2008. – № 5. – С. 40–45.

29. *Шатохина, Н. З.* Краеведческие библиографические ресурсы областных библиотек / Н. З. Шатохина // Библиография. – 2008. – № 2. – С. 31–38.

30. *Ширко, К.* Краеведческая полнотекстовая база данных «Памятники Томска» : опыт создания / К. Ширко, Т. Ширко // Библиосфера. – 2005. – № 1. – С. 83–86.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Электронныя рэсурсы**

1. *Касінская, А. І.* Краязнаўчая інфармацыйная прадукцыя абласных бібліятэк : па матэрыялах даследавання за 2001–2005 гг. / А. І. Касінская // Миссия библиотеки в формировании интеллектуального потенциала общества : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 4–6 дек. 2006 г. / сост. А. А. Капырина ; гл. ред. Л. Г. Кирюхина. – Минск, 2007. – 6 с.

2. *Методика* составления [Электронный ресурс] / Муницип. учреждение культуры «Централизованная библиотечная система» Сормовского р-на, г. Нижний Новгород. – 2011. – URL : http : // libnn.ru/content/view/105/24.

3. *Методика* составления библиографических указателей [Электронный ресурс]. – 2011 / Науч. б-ка Сев.-Вост. федер. ун-та им. М. К. Аммосова. – URL : http : //www.ysu.ru/library/lib_old/posobiya/sbornik/sbo11.htm.

4. *Сороколетова, Н. В.* Экспериментальная разработка единой методики формирования централизованной базы данных по краеведению как нового ресурса НИБЦ «ЛИБНЕТ» [Элект-

ронный ресурс] / Н. В. Сороколетова. – URL : http : //www. gpntb. ru/ win/inter-events/crimea2009/disk/proceeding.html.

5. *Стрыжонак, І. М.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства : тэксты лекцый [Электронны рэсурс] / І. М. Стрыжонак, В. І. Саітава // Электронная бібліятэка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БІБЛІЯГРАФАВАННЕ КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАКУМЕНТАЎ**

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэказнаўства*
*і бібліяграфія (менеджмент), спецыялізацыі 1-23 01 11-01 05*
*Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства*

Рэдактар А. І. Гутарава
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2013. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,73. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ